Перспективы дальнейших исследований в данном направлении могут быть связаны с изучением эффективности различных методов коррекции когнитивных нарушений, разработкой комплексных программ сопровождения пожилых людей и более детальным анализом факторов, способствующих успешному преодолению возрастного кризиса. Также представляет интерес сравнительное исследование особенностей кризиса старости в разных социальных группах и культурах.

Проведенная работа вносит вклад в развитие раздела психологии, посвященному изучению психологии пожилых людей и практической работы с ними. Полученные результаты подтверждают необходимость продолжения исследований в этом направлении и разработки научно обоснованных подходов к поддержке когнитивного и психического здоровья в пожилом возрасте. Решение этих задач приобретает особую актуальность в условиях демографического старения населения и требует консолидации усилий специалистов различных областей – психологов, медиков, социальных работников и организаторов здравоохранения.»

Список использованных источников:

1. Рыбинская, А. В. Психологические характеристики кризиса пожилого возраста / А. В. Рыбинская // Вестник ТГУ. – 2013. – № 7 (123).
2. Руженская, Е. В. Оценка когнитивных функций и методы их коррекции у пожилых людей / Е. В. Руженская, С. В. Смирнова, П. Л. Егорова // Вестник ИвГМА. – 2018. – № 2.

**В.І. АНДРЭЙЧЫК**
Рэспубліка Беларусь, Мінск, ДУА «Акадэмія адукацыі»

# НАРОДНАЯ МУДРАСЦЬ ЯК ЛЮСТЭРКА КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ НАВУЧЭНЦАЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (ПА ВЫНІКАХ КАНСТАТУЮЧАГА ЭКСПЕРЫМЕНТА Ў IX–X КЛАСАХ)

**Уводзіны.** У сучасных умовах развіцця грамадства адбываецца трансфармацыя, якая характарызуецца няўстойлівай сістэмай каштоўнасных арыентацый: традыцыйныя ідэалы губляюць аўтарытэт, а тое, што раней успрымалася як непрымальнае, атрымлівае грамадскае прызнанне. У выніку перад асобай і грамадствам узнікае патрэба ў глыбокім пераасэнсаванні маральных асноў, пераацэнцы і ўмацаванні каштоўнасных арыентацый. У сўвязі з гэтым ўзрастае значэнне базавых агульначалавечых каштоўнасцей, якія становяцца апорай індывідуальнага і калектыўнага самавызначэння. Гэта абумоўлівае асаблівую ўвагу навукоўцаў да канцэпцый, у якіх фарміраванне каштоўнасных арыентацый падрастаючага пакалення, у тым ліку праз родную мову, вызначаецца адным з ключавых напрамкаў адказу на выклікі сучаснасці.

Неабходнасць фарміравання каштоўнасных арыентацый замацавана на дзяржаўным узроўні. У адукацыйным стандарце агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь акцэнтуецца ўвага на ўсебаковым духоўным, сацыяльным і інтэлектуальным станаўленні асобы, падкрэсліваецца значэнне нацыянальных, агульначалавечых і індывідуальна-асобасных каштоўнасцей [1, с. 109-111].

Падлеткавы ўзрост найбольш успрымальны да знешняга ўздзеяння на эмоцыі. Як адзначае В. У. Праскаловіч, «актуалізацыя духоўных магчымасцей навучэнцаў звязана з фарміраваннем у іх маральных ідэалаў, каштоўнасных арыентацый, светапогляду» [2, с. 34].

Мэтай артыкула з’яўляецца аналітычнае асэнсаванне вынікаў канстатуючага эксперымента, характарыстыка стану сфарміраванасці каштоўнасных арыентацый навучэнцаў і вызначэнне прыярытэтных накірункаў далейшага педагагічнага ўздзеяння.

Для дасягнення мэты выкарыстаны наступныя метады: вывучэнне навуковай літаратуры, педагагічнае назіранне, якасны і колькасны аналіз пісьмовых работ навучэнцаў, сістэматызацыя, параўнальны аналіз.

**Асноўная частка.** У даследаванні прынялі ўдзел 320 навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Дыягнастыка ажыццяўлялася ў адпаведнасці з распрацаванай чатырохкампанентнай структурай каштоўнасных арыентацый якая ўключае: ведава-зместавы кампанент (аб’ём і сістэмнасць ведаў пра каштоўнасці, разуменне іх сутнасных характарыстык), эмацыянальна-каштоўнасны (характар і ступень эмацыянальнага прыняцця каштоўнасцей), камунікатыўна-дзейнасны (здольнасць стварыць уласнае выказванне, абгрунтаваць уласную каштоўнасную пазіцыю, рэалізоўваць аксіялагічныя веды ў камунікатыўнай дзейнасці) і рэфлексійна-ацэначны (уменне ажыццяўляць самааналіз і ацэнку ўласных паводзін з пазіцыі агульнапрынятых каштоўнасных норм).

У якасці дыягнастычнага інструментарыю выкарыстаны комплекс заданняў, скіраваных на выяўленне розных аспектаў сфарміраванасці каштоўнасных арыентацый: кагнітыўна-аналітычных, аксіялагічна-сітуацыйных, камунікатыўна-прадуктыўных і рэфлексійных. Кожнаму структурнаму кампаненту адпавядае абагульнены крытэрый ацэнкі, які канкрэтызуецца праз сістэму паказчыкаў.

Ступень сфарміраванасці каштоўнасных арыентацый вызначаецца на падставе чатырох узроўняў, што адлюстроўваюць дынаміку іх развіцця і ўключаюць сукупнасць якасных і колькасных характарыстык. Колькасная ацэнка вынікаў ажыццяўляецца па чатырохбальнай шкале (0, 1, 2, 3 балы), якая дазваляе ранжыраваць паказчыкі ў межах кожнага кампанента.

Для ілюстрацыі ходу канстатуючага эксперыменту звернемся да аналізу задання, накіраванага на выяўленне асаблівасцей ведава-зместавага кампанента каштоўнасных арыентацый.

У заданні навучэнцам прапануецца *дапісаць заканчэнне прыказак: 1. Родная зямелька як зморанаму – пасцелька 2. Хто працуе, той і мае 3. Здаровы багатаму багатаму варт 4. Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў 5. Шануй бацьку з маці другіх не знойдзеш 6. Шануй людзей то і цябе пашануюць 7. Не руш чужога і не бойся нікога 8. Шукай сабе сябра ў бядзе 9. Навука мучыць, а жыць навучыць 10. Языком бервяна не ачэшаш.*

Выкарыстанне народных прыказак абумоўлена тым, што мова народа развіваецца і набывае культурную глыбіню дзякуючы сумеснаму, калектыўнаму вопыту пакаленняў, асабліва ў сферы каштоўнасных арыентацый. Як адзначае В. У. Протчанка, "маральна-этычныя паняцці, спалучэнні слоў, меркаванні і думкі, якія выспявалі вякамі, а многія з іх нават сталі афарызмамі" [3, с. 10]. Яны ўключаны ў канкрэтную культуру, якая з'яўляецца часткай сусветнай. Беларускія прыказкі, як частка вуснай народнай творчасці, ўтрымліваюць нацыяналь культурныя код беларускага народа, які з'яўляецца асновай каштоўнасных арыентацый беларускага грамадства. Уменне навучэнцаў інтэрпрэтаваць сэнс прыказак, працягваць іх змест і звязваць з пэўнымі каштоўнасцямі (праца, здароўе, сяброўства, павага да бацькоў, роднай мовы і інш.) ў спалучэнні са здольнасцю дакладна ўзнаўляць народныя формулы сведчыць пра ступень засваення нацыянальна значных паняццяў і традыцыйных каштоўнасцей, адлюстраваных у вуснай народнай творчасці.

Адказы высокага ўзроўню (13,1%) прадэманстравалі навучэнцы, якія не толькі дакладна дапісалі 9–10 прыказак, але і паказалі глыбокае, асэнсаванае валоданне матэрыялам. Іх адказы сведчаць, што прыказкі з'яўляюцца для іх не проста завучанымі фразамі, а часткай моўнай свядомасці. Напрыклад, некаторыя вучні да прыказкі "*Языком бервяна не ачэшаш" да*давалі варыятыўны працяг *"і сена накосіш, дроў не нарубіш"*, што паказвае веданне падыходзячых па сэнсу адпаведнікаў. Некаторыя навучэнцы дапаўнялі адказы ўласнымі каментарыямі ў дужках, раскрывалі сэнс прыказкі. Напрыклад: *Здаровы багатаму варт (калі чалавек здаровы, ён багацей за багатага). Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў (без ведання гісторыі і роднай мовы свайго народа чалавек бедны, ён нічога не зможа перадаць нашчадкам).* Такія адказы дэманструюць актыўную разумовую працу пры выкананні задання, уменне звязваць народныя выказванні з сучаснымі жыццёвымі рэаліямі і пераносіць іх значэнні на ўласны светапогляд.

У адказах сярэдняга ўзроўню (36,9%) выяўляецца тэндэнцыя да частковага аднаўлення народных прыказак. Большая частка з іх узнаўляецца дакладнымі моўнымі формуламі, а некаторыя прыказкі перадаюцца сваімі словамі, блізкімі па значэнню канструкцыямі, аднак захоўваецца іх асноўны сэнс, значэнне і аксіялагічная скіраванасць. Напрыклад: *Родная зямелька як ... маці для сына; як матка родная; як сэрца роднае. Хто пра-*

*цуе, той ... без хлеба не будзе; добра жыве.* Гэта сведчыць пра тое, што вучні разумеюць агульную каштоўнасную норму, якая зафіксавана ў кожнай прыказцы.

Цяжкасці ўзнікаюць пры аднаўленні менш вядомых і семантычна больш складаных адзінак: З*даровы багатаму ... (не пазайздросціць; фору дасць). Языком бервяна ...(не праверпнеш, не распіліш, не зрубіш).* У гэтым выпадку навучэнцы імкнуцца лагічна завяршыць заданне апіраючыся на ўласны светапогляд.

Такія адказы паказваюць, што базавыя каштоўнасныя арыентацыі (шанаванне працы, радзімы, гістарычнай памяці і інш.) навучэнцамі ўспрымаюцца і прымаюцца. Аднак дакладныя моўныя формы, у якіх замацаваны нацыянальныя культурныя каштоўнасці, застаюцца ў іх пасіўным слоўнікавым запасе. Вучні разумеюць іх сэнс пры прачытванні, але не засвоілі дастаткова добра, каб свабодна імі аперыраваць.

Аналіз адказаў нізкага ўзроўню (32,2%) паказаў цяжкасці як ва ўзнаўленні зместу прыказак, так і ў інтэрпрытацыі іх сэнсу. Для гэтай групы характэрныя тры асноўныя тыпы памылак, што сведчыць пра розную ступень недастатковага засваення аксіялагічнага матэрыялу.

Па-першае, назіраюцца спробы лагічнай рэканструкцыі прыказкі, аднак у параўнанні з сярэднім узроўнем яны носяць больш абмежаваны і спрошчаны характар. Адказы навучэнцаў сведчаць пра разуменне агульнага сэнсу, аднак значныя прабелы ў ведах прыводзяць да таго, што яны ў сваёй большасці зводзяцца да аднаго слова або кароткай фразы: *Родная зямелька як ... маці; душа; як золата. Хто працуе, той есь; той і п'е; той спачывае.* Сустракаюцца адказы з выкарыстаннем жаргоннай лексікі, аднак як станоўчы момант такіх адказаў 0,9 % (3 чалавекі з 320 рэспандэнтаў): *Хто працуе, той кайфуе.* Такія адказы з'яўляюцца павярхоўнымі не адлюстроўваюць поўнай сэнсавай завершанасці прыказак.

Па-другое, замяшэнне блізкіх па структуры прыказак. Навучэнцы нярэдка блытаюць заканчэнні прыказак №5 (*Шануй бацьку з маці ...*) і № 6 (*Шануй людзей ...*), для абодвух выпадкаў механічна выкарыстоўваюць аднолькавы працяг: *і цябе пашануюць; як яны цябе шануюць; і будзе табе добра.* Гэта паказвае на недыферэнцыраванае ўспрыманне матэрыялу, калі навучэнец запамінае асобныя ўстойлівыя фрагменты, не ўнікаючы ў сэнсавую структуру кожнай прыказкі як цэласнай адзінкі.

Па-трэцяе для нездавальняючага ўзроўню характэрны выпадковыя адказы, а для некаторых прыказак – поўная адсутнасць адказаў. Напрыклад: *Здаровы багатаму... ні да чорта; не патрэбен.* Такія адказы сведчаць пра прабелы ў фарміраванні нацыянальна-культурнага кампанента каштоўнасных арыентацый. Назіраюцца недастатковыя веды, цяжкасці ў фарміраванні нават агульных уяўленняў аб каштоўнасцях.

Аналіз адказаў навучэнцаў нездавальняючага ўзроўню (17,8%) паказаў істотныя цяжкасці як ва ўзнаўленні зместу прыказак, так і ў інтэрпрэтацыі

іх сэнсу. Большасць адказаў адсутнічаюць, або ўяўляюць сабой выпадковыя словазлучэнні, якія не маюць сувязі з логікай прыказкі. Напрыклад: *Родная зямелька як ... і поле бульбы.* Такія адказы не з'яўляюцца спробай лагічнай рэканструкцыі, а сведчаць пра адсутнасць разумення сутнасці прыказкі і яе прызначэння як носьбіта народнай мудрасці.

Такім чынам, нізкі ўзровень адказаў адлюстроўвае адсутнасць ведаў і ўнутранага прыняцця каштоўнаснага зместу прыказак. Гэта сведчыць пра недастаткова сфарміраваны ведава-зместавы кампанент каштоўнасных арыентацый і неабходнасць мэтанакіраванай працы па замацаванні ў свядомасці вучняў значэння народнай мудрасці як важнага складніка нацыянальнай культуры.

Колькасныя вынікі задання паказалі розны ўзровень засваення вучнямі народных прыказак. Як бачна з дыяграмы (малюнак), агульны ўзровень правільных адказаў вагаецца ад 29,1% да 61,%, што сведчыць аб значнай разарванасці ў веданні і ўспрыманні вучнямі прыказак як часткі беларускай культуры.




**Малюнак – Суадносіны правільных і няпоўных адказаў навучэнцаў пры вкананні задання**

**Заключэнне.** Агульны ўзровень сфарміраванасці каштоўнасных арыентацый навучэнцаў характарызуецца разнастайнасцю ступеняў іх развіцця. Амаль палова адказаў 48,1% (высокі – 14,7%, сярэдні – 33,4%) сведчыць пра наяўнасць у навучэнцаў базавай сістэмы каштоўнасных арыентацый і гатоўнасці звяртацца да іх пры асэнсаванні вучэбных і жыццёвых сітуацый, у той час як 51,9% адказаў (нізкі – 29,9%, нездавальняючы – 22%) паказваюць на неабходнасць далейшай мэтанакіраванай пе-

дагагічнай падтрымкі ў напрамку паглыблення разумення каштоўнасцей, іх асабістага асэнсавання і пераходу да ўстойлівых перакананняў.

На падставе выяўленых асаблівасцей вызначаны чатыры ўзаемазвязаныя напрамкі эксперыментальнай працы. Першы прадугледжвае паглыбленне разумення каштоўнасцей праз сістэмную працу з аксіялагічным зместам моўнага матэрыялу і яго асэнсаванне на лексічным, граматычным і тэкставым узроўнях. Другі накіраваны на развіццё ўнутранага эмацыянальна-каштоўнаснага прыняцця праз выкарыстанне матэрыялаў, што стымулююць асабісты водгук і свядомую ацэнку. Трэці звязаны з фарміраваннем камунікатыўна-дзейнаснага вопыту – умення аргументавана выражаць і абараняць уласную пазіцыю ў вусным і пісьмовым маўленні. Чацвёрты прадугледжвае развіццё рэфлексійна-ацэначных уменняў праз арганізацыю самааналізу, ацэнкі паводзін і прагназавання іх наступстваў.


Спісак выкарыстаных крыніц:

1. Образовательный стандарт общего среднего образования : постановление Министерства образования Республики Беларусь, утв. 28.11.2025 г., № 199 [Электронный ресурс] // Национальный образовательный портал / Национальный институт образования. – Минск, 2018. URL: https://adu.by/images/2025/12/W22544307p_1765918800.pdf (дата обращения: 02.02.2025) – Текст: электронный.
2. Праскаловіч, В. У. Тэарэтыка-метадычная сістэма сродкаў культуратворчага развіцця вучняў V–X класаў у працэсе навучання беларускай мове: дыс. … док. пед. навук 13.00.02 / Праскаловіч Вольга Уладзіміраўна ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Нац. ін-т адукацыі – Мінск, 2015. – 285 л.
3. Протчанка, В. У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове : Манаграфія / В. У Протчанка. – Мн. : НІА, 2001. – 211 с.



**А.А. АРВАНОВА, Ю.С. МАХЛАЕВА**

Республика Беларусь, Витебска, ВГУ имени П.М. Машерова


## ПАТРИОТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА ПРИ ОЗНАКОМЛЕНИИ С ПРИРОДОЙ РОДНОГО КРАЯ

**Введение.** Дошкольный возраст – ключевой этап становления личности, в рамках которого формируются предпосылки гражданских качеств, развиваются представления детей о человеке, обществе и культуре. Дошкольное образование, являясь начальным уровнем системы образования, призвано формировать у детей первые представления об окружающем мире, отношение к родной природе, малой родине, своему Отечеству.

Патриотическое воспитание в учреждении дошкольного образования основывается на планомерной и последовательной передаче ребёнку исторического и социального опыта белорусского народа, воспитании уважения к государственным символам страны.

Формирование основ патриотизма происходит в процессе длительного целенаправленного воздействия на человека в семье, образователь-